**Білет 11**

**Практычнае заданне.**

**Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Якія воінскія фарміраванні прымалі ўдзел у вызваленні БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў?
2. Калі быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў г. Брэст?
3. Якую ролю ў вызваленні БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адыгралі беларускія партызаны?
4. Складзіце схему: “Прычыны паспяховасці Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён»”.

**I. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён»**



**II. Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён".** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас»)*

У чэрвені 1944 г. пачалася Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён". Яе план заключаўся ў наступным. Войскі Чырвонай Арміі, выкарыстоўваючы дапамогу партызан і мясцовых жыхароў, адначасова пераходзяць у наступленне на віцебскім, аршанскім і бабруйскім напрамках і магутнымі ўдарамі прарываюць абарону праціўніка. Затым яны ліквідуюць групоўкі ворага ў раёнах Віцебска і Бабруйска і наносяць удары на мінскім напрамку з мэтай акружэння і знішчэння войскаў праціўніка ў так званых «катлах».

У ноч на 20 чэрвеня партызаны атакавалі чыгуначныя камунікацыі групы армій "Цэнтр" на ўсім працягу ад лініі фронту да дзяржаўнай граніцы і нанеслі свой знакаміты рэйкавы ўдар. Усяго за адну ноч на 20 чэрвеня 1944 г. было перабіта 40775 рэек. Толькі з 26 па 29 чэрвеня партызаны захапілі, разграмілі і спусцілі пад адхон 147 варожых эшалонаў. Партызаны дэзарганізавалі рух, захапілі і ўтрымлівалі да падыходу Чырвонай Арміі дзясяткі чыгуначных станцый.

Ужо на трэці дзень баявых дзеянняў быў вызвалены Віцебск, на чацвёрты - Орша.

3 ліпеня 1944 г. быў вызвалены Мінск. На ўсходзе і паўднёвым усходзе ад Мінска было завершана акружэнне больш чым 100-тысячнай групоўкі войскаў праціўніка. У ходзе далейшага наступлення Чырвоная Армія 28 ліпеня вызваліла Брэст. Германскія захопнікі былі выгнаны з беларускай зямлі.

**III. З успамінаў нямецкага генерала К. Ціппельскірха**

“Паміж 21 і 23 чэрвеня чатыры рускія фронты пачалі наступленне з двух бакоў Віцебска, на Оршу і Магілёў, а таксама на поўнач і на поўдзень ад Бабруйска з мэтай знішчыць абарону групы армій «Цэнтр». Рускі метад вядзення наступлення з часу апошніх наступальных аперацый стаў яшчэ больш дасканалым… Уласна кажучы, наступу цяпер папярэднічаў больш інтэнсіўны ў параўнанні з папярэднімі аперацыямі шматгадзінны агонь артылерыі на знішчэнне, які спалучаўся з такім жа незвычайным па сваіх маштабах выкарыстаннем буйных сіл авіяцыі. Верагодна, з мэтай дасягнуць найбольшай моцы ўдараў з паветра яны наносіліся з інтэрвалам у адзін дзень па кожнай з трох нямецкіх армій, якія абараняліся на вырашальных кірунках рускага наступлення. Пяхотныя злучэнні, якія перайшлі ў наступленне пасля заканчэння артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі, падтрымліваліся і прыкрываліся выключна эфектыўнымі дзеяннямі авіяцыі. … Пасля завяршэння пяхотай прарыву ў яго неадкладна ўводзіліся танкавыя сілы.

Эфектыўныя дзеянні ў наступленні, якія выключалі магчымасць аказання якой-небудзь дзейснай дапамогі германскім войскам, дазволілі рускім вокамгненна дабіцца такіх буйных поспехаў, што выправіць становішча было ўжо нельга…”.